**МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**

220004, г. Мінск, пр. Пераможцаў, 11, тэл. (017) 203 75 74, факс 203 90 45

# ВЫПІСКА З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ РЭСПУБЛІКАНСКАЙ НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЙ РАДЫ ПА ПЫТАННЯХ ГІСТОРЫКА - КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ ПРЫ МІНІСТЭРСТВЕ КУЛЬТУРЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

16.12.2016 г. № 11-01-01/13

Слонімскі раённы
выканаўчы камітэт

**1. Аб наданні статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці элементу нематэрыяльнай культурнай спадчыны "Традыцыя выпечкі каравояў на Слонімшчыне. Каляндарна-абрадавае печыва".**

Заслухаўшы інфармацыю намесніка дырэктара ДУК "Слонімскі раённы цэнтр культуры, народнай творчасці і рамёстваў" Сегень Г.Л. і экспертнае заключэнне загадчыка аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Валодзінай Т.В. аб элеменце нематэрыяльнай культурнай спадчыны – традыцыі выпечкі, якая захавалася і бытуе на тэрыторыі Слонімскага раёна, ВЫРАШЫЛІ:

1.1. Прыняць да ўвагі, што ў дадзены элемент нематэрыяльнай культурнай спадчыны ўваходзяць: традыцыі выпечкі вясельнага каравая, гасцявога каравая, вялікага траецкага каравая і велікодных пірагоў;

1.2. Адзначыць асаблівасць слонімскага печыва ў яго выпяканні с выкананнем мясцовых звычаяў з песнямі, замовамі і прымаўкамі з улікам таго, што вясельны і гасцявы караваі ўпрыгожваюцца мноствам "шышачак" з цеста, вялікі траецкі каравай упрыгожваецца жывымі кветкамі, альбо бярозавымі галінкамі з лісцем, якія затым захоўваюцца на працягу года, а велікодныя пірагі выпякаюць толькі ў гарачую (чырвоную) пятніцу;

1.3. Пагадзіцца з неабходнасцю надання статусу гісторыка-культурнай каштоўнасці і катэгорыі "Б" нематэрыяльнаму праяўленню творчасці чалавека - "Традыцыя выпечкі каравояў на Слонімшчыне. Каляндарна-абрадавае печыва".

Намеснік Міністра,
Старшыня навукова-метадычнай рады А.А.Яцко

Ходар 209 43 87